**А.П. ЛОНСКІ**
Рэспубліка Беларусь, Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава

# МАРАЛЬНА-ДУХОЎНАЯ СКІРАВАНАСЦЬ ДЗІЦЯЧАГА СВЕТУ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

**Уводзіны.** Сучасная паэзія, як і любое мастацтва наогул, з'яўляецца ў пэўным сэнсе адлюстраваннем таго, як грамадства бачыць тыя ці іншыя з'явы рэчаіснасці і перспектывы свайго творчага развіцця. Асабліва цікава ў гэтых адносінах апеляваць да вершаў з цэнтральнымі «дзіцячымі» вобразамі, бо праз іх мастацкае ўвасабленне чытач бачыць, як дарослыя ўспрымаюць «маленькі» свет, як ставяцца да дзяцей. Грунтоўны аналіз найноўшай «дзіцячай» вершатворчасці яшчэ чакаецца ў будучым, а пакуль справа абмяжоўваецца толькі аглядавымі даследаваннямі (напр., А. Макарэвіча, М. Яфімавай і інш.) у адпаведных навукова-метадычных дапаможніках, альбо водгукамі ці рэцэнзіямі на асобныя творы.

**Мэта** дадзенага артыкула – выявіць асаблівасці адлюстравання дзіцячага свету ў сучаснай беларускай паэзіі, раскрыць значнасць маральна-духоўнага вектара ў ёй. Наша даследаванне праводзілася з выкарыстаннем прыёмаў канкрэтна-гістарычнага, структурна-тыпалагічнага метадаў.

У выніку аналізу зборнікаў М. Мартысевіч, А. Хадановіча, С. Прылуцкага, К. Бандурынай і іншых паэтаў можна зрабіць вывад, што сучасная «дарослая» паэзія мае два асноўныя (сутнасна палярныя) падыходы да адлюстравання свету дзяцей: так бы мовіць, «звужэнне оптыкі» лірычнага героя да стану дзіця і яе «пашырэнне», калі лірычным героям-дзецям «прыпісваюцца» развагі і светаўспрыманне ўжо дарослага чалавека.

Першы з адзначаных падыходаў прасочваецца ў творах Марыі Мартысевіч. Так яе зборнік «Як пазбыцца Маматута» мае ўзроставы цэнз 18+ і падназву «дзіцячыя вершы для дарослых». Там паэтка апісвае будзённыя для сямейнага жыцця рэчы з пазіцыі дзіцяці, што ні ў чым не ведае страху, а ўсё наіўна ўспрымае як прыгоды, мае багатую фантазію (верш «Калыханка для пілота» [1, с. 62] з прысвячэннем «Дэвіду Боўі, калі ён быў маленькім» і інтэртэкстуальнымі спасылкамі на яго песню «Space Oddity»). Пры гэтым маленькая гераіня нязгодная са стаўленнем да сябе як да дзіцяці, таму скептычна ўспрымае ласкавыя звароты накшталт «коцік», «ваўчок», «парсючок»: «Зірну горда з-пад павек: / – Гэй, бацькі, я – ЧАЛАВЕК!») [1, с. 11].

У вершы Мартысевіч «Слава – Ісусу Хрысту» [2, с. 10] лірычны герой крыху старэйшы і ўжо ходзіць у школу. Сам твор напісаны ў выглядзе ліста да Бога, які герою прапануе напісаць святар. Мастацкі прыём «звужэння оптыкі» тут праяўляецца ў моўнай стылізацыі пад манеру яшчэ не зусім пісьменнага дзіцяці («У мяне ўсё добра, хоць з сенцябра / я жыву ў дзярэўне, / трохі сумую за пацанамі з двара») [2, с. 10]. Лірычны герой мае толькі частковае ўяўленне пра Бога: «Баба Стэфа гавора, што Ты памёр і ўваскрос, / і Ты ўсё можаш, / і што Ты нават лепей, чым Дзед Мароз, / бо Ты Сын Божы») [2, с. 10]. Разам з тым у гэтым творы закранаюцца праблемы, якія хвалююць дзіця: «Так зрабі, каб маму не пазбаўлялі бацькоўскіх праў / (каб не было падставы). / Прабач, калі адарваў ад сур'ёзных спраў. / Твой ~~раб~~ Станіслаў» [2, с. 10].

Большасці вершаў такога плана ўласціва пэўная ступень іроніі, але нягледзячы на гэта аўтары нярэдка ўздымаюць сапраўды важныя пытанні, з якімі сутыкаецца дзіця, і асэнсоўваюць адметнасці іх рэцэпцыі. Так у вершы «Шануй бацькоў сваіх» Крысціна Бандурына таксама «звужае оптыку» лірычнага героя да стану, калі ён, як маленькі, бачыць усе з'явы толькі чорнымі ці белымі:

«маці была белай
і яе лёгка было любіць
а бацька быў чорным
яго любіць не выпадала» [3, с. 10].

Думаецца, у педагагічнай дзейнасці такія вершы могуць дапамагчы ў псіхалагічнай працы са складаным вучнем, простымі словамі патлумачыць іх супярэчлівыя эмоцыі і ўчынкі.

Другі з асноўных мастацкіх спосабаў выяўлення дзіцячага свету ў творах сучаснай паэзіі – гэта «пашырэнне оптыкі», пры якім вобразу дзіцяці надаюцца неўласцівыя для яго думкі і развагі. Добры прыклад такога лірычнага героя можна назіраць у вершы Сяргея Прылуцкага «Калі кубікі былі маладыя» [4, с. 108]. Як і многім іншым адпаведным творам, яму характэрна

пэўная рэтраспектыўнасць, успаміннасць, якая і праяўляецца тут праз дарослыя крытычныя заўвагі кшталту «ведама я меў там купу забавак / гумовыя танчыкі лялькі наборы скакалак / і з гэтаю наіўнаю бутафорыяй / было хоць і адносна але ўсё-ткі весела» [4, с. 108].

Асаблівая каштоўнасць такіх вершаў у тым, што яны з дарослага пункту гледжання апісваюць і ненавязліва тлумачаць дзіцячыя пачуцці. Так у вершы Андрэя Хадановіча «Лета: вясковы раманс» [5, с. 10–11] раскрываецца каханне лірычнага героя-школьніка да суседскай дзяўчыны. З аднаго боку, сябры тлумачаць герою, што «кахаюць прыдуркі, а ты лепей жабу закінь ёй у станік. / Рамантыка – гэта не соплі і буські. (За вуснамі – іклы) » [5, с. 10–11], але, з іншага боку, ён закахана адчувае, як «ад ейнага спеву закладвала вушы салодкаю ватай» [5, с. 10–11].

**Заключэнне.** Такім чынам мы выявілі, што ў сучаснай айчыннай паэзіі дамінуюць два мастацкія спосабы раскрыцця дзіцячага свету: непасрэдна ў суб’ектыўнай (нібыта ўласна дзіцячай) форме аўтарэфлексіі і ў форме аб’ектыўных, аналітычных разваг-успамінаў пра маленства. Гэтыя спосабы дазваляюць аўтарам з розных бакоў падыходзіць да адлюстравання дзіцячых эмоцый і іх маральна-этычнай аксіялогіі, што робіць творы каштоўным матэрыялам у выхаваўчым працэсе новай генерацыі.

Спіс цытаваных крыніц:
1 Мартысевіч, М. Як пазбыцца Маматута / М. Мартысевіч. – М.: Выдавец Н. Кандрусевіч, 2020. – 64 с.
2 Мартысевіч, М. Амбасада: вершы свае і чужыя / М. Мартысевіч. – М.: Кнігазбор, 2011. – 120 с.
3 Бандурына, К. Homo: вершы / К. Бандурына. – Мінск: Галіяфы, 2019. – 72 с.
4 Прылуцкі, С. Герой эпохі стабільнасці / С. Прылуцкі. – М.: Логвінаў, 2013. – 136 с.
5 Хадановіч, А. Школа травы: кніга вершаў / А. Хадановіч. – М.: Кнігазбор, 2019. – 84 с.

**А.М. МАЛАХОВСКАЯ**
Российская Федерация, Красноярск, Сибирский федеральный университет

## ОБРАЗ БУДУЩЕГО СОВРЕМЕННЫХ ПОДРОСТКОВ НА ОСНОВЕ АНАЛИЗА ИХ СОБЫТИЙНОГО МИРА

**Введение.** Проблема самоопределения рассматривалась множеством исследователей. Л.С. Рубинштейн раскрывает самоопределение в контексте детерминации – зависимости процессов от порождающих их факторов. Он говорит о важности собственной активности индивида и осознанного стремления занять определенную позицию [1, с. 42].

Т.Н. Сапожникова определяет жизненное самоопределение как «свободный выбор человеком смысла собственной жизни и ее перспектив на основе рефлексивно-ценностного осмысления прошлого и настоящего в момент узловых жизненных событий» [2, с. 17].

У зарубежных авторов используется близкое понятие «психосоциальная идентичность». Э. Эриксон рассматривает процесс взросление через призму понятия «идентичность» – целостность личности. Формирование идентичности – это идентификация ребенка со взрослым. Подростку же необходимо выработать картину мира, синтезируя все ценности, оценки и переживания детства [3, с. 63].

Цифровизация жизни, ее повышающаяся мобильность усложняют процесс самоопределения личности, в то время как общеобразовательная система требует, чтобы подросток совершал выбор, значительно влияющий на его дальнейшую жизнь в момент, когда у старшеклассников психологическая готовность к выбору еще не сформирована.

Одним из условий жизненного самоопределения является способность построения своего жизненного пути исходя из опыта прошлого. Актуальное представление человека о своем прошлом и будущим, по К. Левину, – это временная трансспектива. Проблему временной трансспективы он рассматривал в рамках разработанной им концепции «психологического поля в данный момент времени», согласно которой прошлое и будущее объединяются в психологическом настоящем [4, с. 84].

По мнению Л.С. Выготского, понимание человеческой личности в полной мере невозможно, если рассматривать ее без связи с прошлым и будущим, превращающих «историю жизни человека из ряда бессвязных и разрозненных эпизодов в связный, единый биографиче-